быцця і кожны чалавек, які нараджаецца на свет, пра якога толькі можна сказаць, што ён ёсць, але яшчэ нельга сказаць, што ён ёсць, – становіцца чымсьці, г. зн. праяўляе пэўную сваю сутнасць”.

У жанры аповесці чалавечая сутнасць праяўляецца, на нашу думку, найбольш канцэтравана, ярка і пераканаўча. Аб гэтым сведчыць эвалюцыя жанру аповесці ў беларускай літаратуры.

**А.Я. Рак**

## АСАБЛІВАСЦІ КАМПАЗІЦЫІ “ДЫЯЛОГУ ЛІТОЎСКАГА ШЛЯХЦІЦА” Г. ПЕЛЬГРЫМОЎСКАГА

Зусім нядаўна беларускія літаратуразнаўцы пашырылі поле сваіх даследаванняў, уключыўшы ў гісторыю беларускай літаратуры шэраг таленавітых польскамоўных паэтаў канца XVI – пачатку XVII ст. Гэта такія аўтары як Андрэй Рымша, Ян Казаковіч, Ян Пратасовіч і найбольш цікавы для нас Гальяш Пельгрымоўскі.

Г. Пельгрымоўскі быў не толькі паэтам і мемуарыстам эпохі Рэнесансу, ён займаў пачэсную пасаду пісара Вялікага Княства Літоўскага, быў актыўным палітычным дзеячам. Г. Пельгрымоўскі пакінуў некалькі гістарычных паэм на дакументальнай аснове, сярод якіх “Пасольства Льва Сапегі да вялікага князя маскоўскага”, “Размова аднаго паляка з маскалём на замку маскоўскім у годзе 1601”, “Дыялог літоўскага шляхціца…”.

Напісаны ў 90-я гады XVI ст. “Дыялог літоўскага шляхціца…” лічыцца адным з самых вялікіх твораў Пельгрымоўскага, яго поўная назва: “Dialog slachcica litewskiego prawdziwy wojny Inflanckiej… Króla... Stefana z Księdzem Moskiewskim od początku do końca krótko zebrany”. Паэма была надрукаваная ў Вільні ў друкарні Якуба Марковіча ў 1594 г.

“Дыялог літоўскага шляхціца…” прысвечаны Лівонскай вайне. Твор Г. Пельгрымоўскага адрозніваецца ад астатніх тэматычна блізкіх паэм найперш задачамі, пастаўленымі аўтарам. Г. Пельгрымоўскі стараўся не проста расказаць пра асноўныя падзеі гэтай вайны, але і пераканаць чытача ў тым, што імкненне Масковіі завалодаць Інфлянтамі – не абгрунтаванае гістарычна і супярэчыць усім чалавечым законам. У той жа час ваенныя дзеянні з боку Вялікага Княства Літоўскага, паводле канцэпцыі аўтара, з’яўляюцца толькі мерамі неабходнай абароны

Паэма Г. Пельгрымоўскага, акрамя асноўнай часткі, уключае прадмоўна-пасляслоўны комплекс, які складаецца з вершаванага прысвячэння на герб “Pana Jana Glebowicza Wojewodzicza Trockiego”, празаічны ўступу і звароту “Do Cytelnika”, які выступае ў якасці пасляслоўя. Асноўная частка мае назву “Rozmowa trzech osob o wojnie Krola Jego M. Stephana świętej pamięci Pana naszego z wielkim Księdzem Moskiewskim o Inflanty”.

У вершаваным прысвячэнні Г. Пельгрымоўскі расшыфроўвае значэнне герба Глебавічаў, ухваляе іх вартасці. У празаічным уступе аўтар тлумачыць прычыны напісання паэмы даўняй традыцыяй ухваляць пераможцаў пры вяртанні: “ Był zawsze nie tylko u Pogan ale y u Chrześcian ten zwyczaj że gdy Pan Krol Monarcha oswobodziwszy Państwo swe z jakim szczęsliwym zwycięstwem wracał się do domu że więc poddani werni wyrzadzając mu jako zwyciescy poczciwość weselem tryumfy y rozmaicie radującemu się spiewaniem pisaniem pokazowali mu radość y wdzięczność swą” (Pelgrzymowski, 1594, c. 18). З гледзішча кампазіцыйнай будовы названыя часткі не адыгрываюць вялікай ролі ў творы. Асноўная частка, “Размова трох асоб… пра вайну за Інфлянты”, уяўляе сабой пераказ асноўных падзей Лівонскай вайны, які вядзецца Ганцом, а пасля Рыцарам. У ролі ўдзячнага слухача выступае Чэх, які не толькі ўважліва слухае расказы, але і ахвотна пагаджаецца з ацэнкай падзей, што даюць яго суразмоўцы. Праз словы Ганца, а потым Рыцара выкладаецца аўтарская канцэпцыя Лівонскай вайны. Расказы Ганца (а пасля і Рыцара) адлюстроўваюць уяўленні і ўзровень эрудыцыі самога аўтара. Названая частка паэмы пачынаецца маналогам Чэха, які бачыць на Усходзе водбліскі бітваў і губляецца ў здагадках, што там адбываецца:

Idzie płomień okrutny spulnocy wychodzi
Ze aż tu do nas lego blask straśny zychodzi.
Prosto jako na morzu wały wiatrem grają
Tak się ogeń pod Niebem dymy z nim merają.
Ze to widząc aż włosy na głowie wstawają (Pelgrzymowski, 1594, c. 21).

На яго шчасце, на дарозе з’яўляецца Ганец, які можа ўсё патлумачыць. Сустрэча Ганца і Чэха апісваецца як звычайная размова двух людзей, што выпадкова спаткалі адно аднаго на дарозе. Стомлены спадарожнік і гасцінны гаспадар вітаюцца і знаёмяцца. Ганец як непасрэдны сведка падзей на ўсходзе лічыць сваім абавязкам даць Чэху

самыя падрабязныя і дэталёвыя тлумачэнні, і таму яго словы займаюць цэлыя старонкі твора. На працягу ўсяго аповяду Чэх толькі зрэдку ўстаўляе ўдакладняльныя пытанні. Яго ўдзел у размове з'яўляецца настолькі нязначным, што гэта дае падставы сумнявацца ў мэтазгоднасці ўвядзення дадзенага персанажа ў "дыялог". Як адзначае С. Кавалёў, "заяўлены як дыялог твор Г. Пельгрымоўскага больш падобны на рэпартаж (так званыя навіны) альбо хроніку" (Кавалёў, 2002, с. 160). Прысутнасць асобы Чэха абумоўленая толькі спосабам рэалізацыі стратэгіі пісьменніка: Чэх неабходны ў якасці слухача, а яго пытанні – толькі сродак актуалізацыі апавядання пра вайну. Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў "Дыялогу літоўскага шляхціца" назіраецца пэўная неадпаведнасць формы і зместу: гэты твор па сутнасці не з'яўляецца гутаркай, і, адпаведна, знаёмства персанажаў, якое фармальна выглядае як завязка, не аказвае значнага ўплыву на сюжэт і яго нельга лічыць элементам кампазіцыі.

Насамрэч, галоўнымі дзеючымі асобамі "Дыялогу літоўскага шляхціца" з'яўляюцца Стэфан Баторый, які адыгрывае ролю ідэальнага героя і Іван Грозны, антыгерой, які ўвасабляе ў сабе ўсе магчымыя заганы. Як экспазіцыю твора можна разглядаць сфальсіфікаваную міфалагічную "перадгісторыю", якой Іван Грозны абгрунтоўвае свае прэтэнзіі на Інфлянцкія землі. Ганец не забываецца згадаць палітычна-эканамічныя вартасці Інфлянтаў, што прыцягвалі заваёўнікаў – выхад да мора, вялікія гарады і палацы:

Kraj Inflancki co w sobie ma porty okwite
Miasta wielkiey mocne zamki nie dobyte (Pelgrzymowski, 1594, c. 21).

Завязкай "Дыялогу літоўскага шляхціца" мэтазгодна лічыць гістарычную спасылку на прычыны ўзнікнення вайны: Ганец апавядае пра напад Масковіі на Інфлянты, у выніку чаго яны былі вымушаныя звярнуцца за дапамогай да польскага караля Жыгімонта Аўгуста. Такім чынам, Рэч Паспалітая была вымушаная прыняць удзел у гэтай кравапралітнай, але справядлівай са свайго боку вайне і "абараніць" Інфлянты ад захопнікаў-маскавітаў. Суразмоўца Ганца Чэх ахвотна пагадзіўся з прыведзенымі фактамі і пацвердзіў, што Інфлянты належаць не маскавітам, а Літоўскаму княству:

To żeśmi wypowiedział pryczyne tey wojny
Początek iey skąd poszła y dowod pryzstoyny

O tey ziemi Inflanckiey że do Litewskiego
Księstwa należy nie do Moskiewskiego (Pelgrzymowski, 1594, c. 22).

Ганец расказвае пра такія гарады як Віцебск, Полацк, Вялікія Лукі, бітвы за якія сталі важнейшымі этапамі першых двух гадоў вайны. Адзначаецца, што часам Стэфан Баторый цярпеў паражэнні, але ў выніку перамога засталася на яго баку. Менавіта апісанне трыумфу Стэфана Баторыя і з'яўляецца, на наш погляд, кульмінацыяй твора. Бітвай за Вялікія Лукі завяршаецца аповяд Ганца. Пра далейшае развіццё падзей Чэх, а разам з ім і чытач, даведваецца з вуснаў іншага героя, Рыцара, які своечасова з'яўляецца на дарозе. Менавіта ён – той літоўскі шляхціц, згаданы ў загалоўку. Рыцар зрабіў свой унёсак у высакародную справу змагання з тыранам, і зараз, здабыўшы добрую славу, вяртаўся дахаты. У гэтага шляхціца, непасрэднага ўдзельніка бітваў, сваё меркаванне аб прычынах вайны, якія ён бачыць не столькі ў сквапнасці ўладароў краін, колькі ў божым наканаванні, неспасцігальным для чалавечага розуму. Ягоная прамова на гэтую тэму ў якасці пазасюжэтнага элемента ўключаная ў твор:

Sądy Boże są dziwne a nie dośćignione
Ludzką myslą Niebieskie losy nie widome.
Wedlyg ktorych zawszedy swiat się z czasem mieni
W Europie też y wszedy dzieie się na ziemi.
Mars straszny iadowitem dniewiem roziatrzony
Rospuścił strsały swoie ostrze w tamte strony (Pelgrzymowski, 1594, c. 58).

З вуснаў Рыцара мы даведваемся пра перамогі войскаў Стэфана Баторыя, апісаныя ў антычных традыцыях: урачыста і ўзнёсла. Тое, што аўтар-гуманіст, які ў цэлым асуджае вайну як з'яву, з захапленнем апісвае ваенныя здзяйсненні ўладара Рэчы Паспалітай, на першы погляд падаецца парадаксальным. Насамрэч, аўтары раздзівілаўскага цыклу выразна размяжоўвалі захопніцкую і абарончую войны. Яны лічылі абарончую вайну, вайну за мір цалкам справядлівай і апраўданай. Акрамя таго, важнае, а часам нават галоўнае, месца ў гераічных паэмах займае тэма справядлівай помсты, якая з'яўляецца непазбежным вынікам парушэння божых і чалавечых законаў. Аповяд Рыцара завяршаецца заключэннем Ям-Запольскага мірнага пагаднення, што можна лічыць развязкай гэтага твора.

To gdy się tak w Zapolsku przez posły skończyło
I pyzemierye stateczne utwerdzone było

Wojska się do obozow zewsząd ściądnąć iełу
Aby stamtęd zebrawszy w domech swych wytchneły (Pelgrzymowski, 1594, с. 79).

Такім чынам, мы разгледзелі “Дыялог літоўскага шляхціца…” і высветлілі, што ён мае складаную і неадназначную кампазіцыйную будову. Хутчэй за ўсё, Гальяш Пельгрымоўскі не валодаў талентам адметнага вершаскладальніка, але ён несумненна быў патрыётам сваёй радзімы, палымяным рытарам і з уласцівай яму педантычнасцю заўсёды падмацоўваў свае прамовы доказамі і фактамі. Яго сучаснікі: Стэфан Баторый, Крыштоф Радзівіл, Канстанцін Астрожскі, Міхал Вішнявецкі і інш., баранілі гонар сваёй радзімы ў бітвах з маскавітамі, а Г. Пельгрымоўскі старанна натаваў ўчынкі сваіх слынных землякоў для таго, каб звесткі пра гэтых дзеячаў дайшлі да нашчадкаў у сваім сапраўдным выглядзе. Менавіта гэты аспект, на наш погляд, з’яўляецца самым каштоўным у творчасці Г. Пельгрымоўскага.